**А.А. Дубовік**

# ПАЛЕМІКА ВАКОЛ АСОБЫ К. КАЛІНОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XX СТ.

90-я гады XX ст. – этап актыўнага пераасэнсавання духоўна-гістарычных каштоўнасцей беларускага народа. Прынцыповыя пераацэнкі закранулі і постаць К. Каліноўскага. Ідэалізацыя асобы рэвалюцыянера, якая адбывалася ў савецкія часы, саступіла месца крытычнаму падыходу, пошуку сапраўднага месца К. Каліноўскага ў беларускай гісторыі і культуры. У сувязі са зменамі ў палітычным, культурным жыцці з’явілася магчымасць разглядаць дзейнасць К. Каліноўскага пад “мікраскопам”, без купюр і ідэалагічнай зададзенасці. Пазбаўленне ангажыраванасці і ідэалагізацыі ў даследчыцкай дзейнасці паспрыялі ўзнікненню новых, часам надзвычай смелых і нечаканых поглядаў на асобу беларускага рэвалюцыянера.

Неаднароднасць навуковых трактовак, якія тычыліся ролі і месца К. Каліноўскага ў працэсе станаўлення беларускай нацыі, прывяла ў 1990 г. да пачатку палемікі паміж вядомымі беларускімі даследчыкамі. Штуршком паслужыў артыкул У. Казберука “Маякі і міражы”, змешчаны ў газеце “ЛіМ” 7 снежня 1990 г. [8]. У. Казбярук узнімае пытанне праўдзівасці гісторыі, гаворыць пра неабходнасць пераацэнкі фактаў і падзей мінулага: “…наша бяда ў тым, што на працягу многіх дзесяцігоддзяў гісторыя падавалася … з купюрамі. Калі нейкі дзеяч не падабаўся заканадаўцам у галіне ісціны (гістарычнай, палітычнай, філасофскай і іншай), то яго абвяшчалі нягоднікам па ўсіх параметрах, а яго творы – каб не выклікалі недаверу да афіцыйных версій і ўзаконеных думак – запраторвалі ў спецфонды, хавалі ў надзейныя сейфы. А ўжо калі хтосьці падаваўся героем – то на ўсе сто працэнтаў” [8, с. 7]. Да ліку такіх “штучных” герояў У. Казбярук залічыў К. Каліноўскага, якога, як сцвярджае даследчык, нашы гісторыкі, пісьменнікі і публіцысты абвясцілі беларускім нацыянальным героем, “рыцарам sans peir et sans zeproche (“без страху і заганы”)” [8, с. 7]. У. Казбярук прызнае ў К. Каліноўскім заступніка сялян, выкрывальніка несправядлівасці, якая панавала ў грамадстве. Спрэчнымі, на думку аўтара, застаюцца пытанні, якія тычацца палітычнай, рэлігійнай і нацыянальнай пазіцый К. Каліноўскага. Гэтыя тры вострапалемічныя аспекты пакладзены ў аснову навуковай дыскусіі, якая разгарнулася ў рэспубліканскай прэсе ў 1990–1997 гг.

Разглядаючы рэлігійную праблематыку ў творах К. Каліноўскага, У. Казбярук абвінавачвае яго ў “сярэдневяковым цемрашальстве” і “абмежаванасці кругагляду”. Нельга не пагадзіцца з аўтарам артыкула ў тым, што беларускі рэвалюцыянер выказвае надзвычайную агрэсію і пагарду да праваслаўя. “Ні адзін ужэ, можа, забыўся, – піша К. Каліноўскі ў шостым нумары “Мужыцкай праўды”, – што бацька яго быў яшчэ справядлівай уніяцкай веры і ніколі ўжэ не спомніць на тое, што перавярнулі яго на сызму, на праваслаўе, што ён сягодня, як той сабака, жыве без веры і, як сабака, здохне чартам да пекла!!!” [9, с. 35–36]. На нашу думку, антыправаслаўная пазіцыя К. Каліноўскага тлумачыцца не столькі яго асабістай нянавісцю да праваслаўя, колькі агітацыйнымі мэтамі – праваслаўную веру К. Каліноўскі трактуе як “царскую”, веру “маскоўскага” урада, у якую беларусаў ахрысцілі прымусова. Уніяцкая ж вера, як упэўнівае К. Каліноўскі, з’яўляецца спрадвечнай верай дзядоў і прадзедаў, а значыць сапраўднай верай беларускага народа, гвалтоўна адабранай некалькі дзесяцігоддзяў назад. Іншая справа, што К. Каліноўскі безумоўна перабраў у сродках уздзеяння на селяніна – гаворачы пра рэлігійную свабоду, ён не пераконвае ці тлумачыць, а загадвае, навязвае сваю пазіцыю як адзіна магчымую.

Другое важнае пытанне ўзнімае У. Казбярук: ці лічыў сябе беларусам К. Каліноўскі? Ці думаў ён пра Беларусь, як пра адметную, самабытную нацыю? Сам даследчык адмоўна адказвае на гэта пытанне. У якасці доказаў У. Казбярук прыводзіць цытату з верша К. Каліноўскага “Бывай здаровы, мужыцкі народзе”, дзе замест слова *мужыцкі* просіцца, на думку вучонага, *беларускі,* а таксама цытуе чацвёрты нумар “Мужыцкай праўды” (пра навучанне “па-маскоўску”). “Тое, што К. Каліноўскі выступаў супраць “маскоўскай” мовы, само па сабе зусім не значыла, што супрацьпастаўляў ёй беларускую і дапускаў магчымасць увядзення яе ў школах” [9, с. 12]. Але аўтар артыкула быццам недачытаў “Мужыцкую праўду”, у сёмым нумары якой К. Каліноўскі выразна гаворыць пра навучанне на беларускай мове. Пра гэты факт падрабязна будуць весці гаворку ў палемічных адказах апаненты У. Казберука.

Даследчык зазначае, што нідзе ў “Мужыцкай праўдзе” не гаворыцца пра ідэю незалежнасці Беларусі. Але гэта, на наш погляд, абумоўлена спецыфікай газеты. Выданне было адрасавана ніжэйшаму саслоўю – сялянству, адпаведна і гаворку К. Каліноўскі імкнуўся весці на ўзроўні сялянскага светаадчування. Разумеючы немэтазгоднасць адкрытага закліку за незалежнасць Беларусі, які сяляне не ўспрынялі б, К. Каліноўскі

ў "Мужыцкай праўдзе" апелюе блізкімі мужыку паняццямі – зямельная ўласнасць, паншчына, рэкрутчына. Такія катэгорыі хутчэй паўздзейнічаюць на мужыка, чым несфармуляваная дакладна на той час, абстрактная для мужыка ідэя суверэнітэту Беларусі. Імкненне рэвалюцыянера стварыць незалежную дзяржаву скразной лініяй праходзіла праз усю яго дзейнасць, што гучыць у "Пісьмах з-пад шыбеніцы", адзначаюць удзельнікі і сведкі паўстання.

У артыкуле "Маякі і міражы" закранаецца таксама пытанне пра сутнасць узнікнення паншчыны, сфармуляванае К. Каліноўскім. У. Казбярук катэгарычна не згаджаецца з трактоўкай рэвалюцыянера, абвінавачвае яго ў скажэнні падзей мінулага. Сапраўды, тлумачэнне ўзнікнення паншчыны досыць простае і наіўнае, але яно зразумелае і даступнае для сялян. Яны наўрад ці чыталі б складаныя тэорыі пра эканамічныя і палітычныя прычыны ўзнікнення прыгону, і не паверылі, што чуюць гэта ад мужыка.

У адказ на прапанаваны У. Казберуком нетрадыцыйны, насуперак агульнапрынятаму, погляд на постаць К. Каліноўскага і яго ролю ў беларускай гісторыі быў апублікаваны шэраг палемічных матэрыялаў гісторыка М. Біча "Хай народзіцца ісціна…" (ЛіМ, 22 лют. 1991 г.) [5], "У крывым люстэрку: Кастусь Каліноўскі: праўда і вымыслы" (Настаўніцкая газета. 17, 24, 27 ліп. 1991 г.) [4], "Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863–64 гг." (Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 3) [2].

Палемізуючы з У. Казберуком наконт нацыянальнага пытання ў праграме К. Каліноўскага, М. Біч спасылаецца на сведчанні афіцыйнага гістарыёграфа паўстання В. Ратча, удзельнікаў паўстання Ю. Яноўскага і Я. Гейштара, якія характарызавалі беларускага рэвалюцыянера як барацьбіта за самастойнасць Літвы і Беларусі. "Гэта быў чалавек, душою і сэрцам адданы простаму люду і бацькаўшчыне, прасякнуты крайнімі тэорыямі, прытым літоўскі сепаратыст…" [4, с. 3].

Ідэя самастойнасці беларускага народа, як лічыць М. Біч, даволі поўна прасочваецца ў "Мужыцкай праўдзе" – у разважаннях К. Каліноўскага пра вольнасць, грамадскі парадак, у сфармуляваным ім прынцыпе "самарондства". Адсутнасць у творах К. Каліноўскага лозунгаў аб ліквідацыі памешчыцкага землеўладання, барацьбы за дзяржаўную самастойнасць Літвы-Беларусі М. Біч тлумачыць складанасцю становішча К. Каліноўскага, які залежыў ад варшаўскага паўстанцкага цэнтра і быў вымушаны падпарадкоўвацца яго задачам і стратэгіі барацьбы. Гісторык цытуе малавядомы пратэст К. Каліноўскага, у якім гаворыцца, што Літоўскі

Правінцыйны Камітэт падпарадкоўваецца "галаве паўстання", толькі таму, што "па-першае, не жадае пачынаць згубных для рэвалюцыі разладаў і нязгодаў і, па-другое, з-за таго, што не адчувае сябе дастаткова моцным, каб вырваць кіраўніцтва справамі з рук сваіх праціўнікаў" [2, с. 41].

М. Біч лічыць, што У. Казберук скажае пазіцыю К. Каліноўскага ў асвятленні рэлігійнага пытання, не ўлічвае яго імкненне "выкарыстаць усе сродкі і магчымасці для мабілізацыі беларускага сялянства на ўзброенае паўстанне супраць царызму" [4, с. 3]. На думку М. Біча, асноўны пафас шостага нумару газеты не ў аб'яўленні "схізмай" праваслаўя, а ў асуджэнні здрадніцтва "веры дзядоў і прадзедаў". Аднак мы не можам цалкам пагадзіцца з даследчыкам. Сутнасць пазіцыі К. Каліноўскага, на наш погляд, таксама ў асуджэнні гвалту, прымусу над выбарам рэлігіі, навязвання царскім урадам праваслаўнай веры як адзіна магчымай.

Палымяная дыскусія беларускіх навукоўцаў не засталася па-за ўвагай найбольш аўтарытэтнага і знакамітага даследчыка жыцця і дзейнасці К. Каліноўскага Г. Кісялёва. Нягледзячы на тое, што Г. Кісялёў не ўступіў адкрыта ў палеміку, яго публіцыстычныя матэрыялы [11; 12; 13] змяшчаюць шмат слушных заўваг па ўзнятых у палеміцы пытаннях. У адказ на прэтэнзіі У. Казберука адносна рэлігійнай нецярпімасці К. Каліноўскага, ідэалізацыі ім гісторыі Рэчы Паспалітай Г. Кісялёў звяртае ўвагу на спецыфіку "Мужыцкай праўды" як агітацыйнага выданння для народа, дзе многія пытанні тлумачыліся спрошчана. Таксама Г. Кісялёў асвятляе ў сваіх матэрыялах праблему нацыянальнай самаідэнтыфікацыі К. Каліноўскага. Нацыянальная ідэя, як лічыць Г. Кісялёў, не ўкладаецца ў К. Каліноўскага ў адну прамую формулу. Яе можна адшукаць ў паролі віленскай рэвалюцыйнай арганізацыі, у апошнім звароце да народа, "… у творчасці і дзейнасці Каліноўскага без цяжкасці знаходзім усе неабходныя элементы-чыннікі, з якіх гэтая ідэя складваецца" [10, с. 6]. Ідэя адметнасці Літвы-Беларусі, падкрэслівае даследчык, гучыць у самой логіцы разважанняў у "Мужыцкай праўдзе".

Актыўны працяг дыскусія атрымала ў 1997 г. у матэрыялах У. Казберука "Загадка Каліноўскага" (Беларуская мінуўшчына. 1997. № 5), "Канстанцін Каліноўскі і яго нацыянальная ідэя" (Голас Радзімы. 2, 9, 16, 23 кастр. 1997. г.) і М. Біча "І думаў аб самастойнасці Літвы…" (Беларуская мінуўшчына. 1997. № 5), "Пошук ісціны ці шальмаванне?" (Голас Радзімы. 11, 18 снеж. 1997 г.). Асноўныя тэмы, закранутыя ў матэрыялах 1997 г. – аўтарства "Пісьма ад Яська-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай" і ўзаемаадносіны К. Каліноўскага

з варшаўскім Нацыянальным Камітэтам. У. Казбярук лічыць, што ў сярэдзіне XIX ст. беларуская нацыянальная свядомасць яшчэ не была сфармулявана як з'ява, адпаведна няма ніякіх падстаў гаварыць пра нацыянальнае ўсведамленне кіраўнікоў паўстання на Беларусі, у тым ліку і К. Каліноўскага. Таму, піша У. Казбярук, зразумелым становіцца з'яўленне на свет такога беларускамоўнага дакумента як "Пісьмо…". Прыналежнасць "Пісьма…" пяру К. Каліноўскага неаднаразова абвяргалася. М. Біч, Г. Кісялёў, а таксама папярэднія даследчыкі А. Смірноў, А. Александровіч і інш. канстатавалі, што характар "Пісьма…" зусім не адпавядаў ідэям і светапогляду К. Каліноўскага, таксама адным з "фармальных доказаў" таго, што К. Каліноўскі не быў аўтарам "Пісьма…" з'яўляецца наяўнасць адбітка пячаткі друкарні Нацыянальнага ўрада на дакуменце. У. Казбярук настойліва працягвае спасылацца на гэты твор у адстойванні свайго пункту гледжання. У якасці галоўнага контраргумента даследчык прыводзіць той факт, што з'яўленне на "Пісьме…" адбітка пячаткі друкарні нацыянальнага ўрада цалкам заканамерна. Паводле Дэкрэта ад 10 мая 1863 г. Цэнтральны камітэт быў пераўтвораны ў Нацыянальны ўрад. Адпаведна, усе дакументы, якія з'явіліся пасля гэтай даты, павінны былі мець адбітак пячаткі друкарні менавіта Нацыянальнага ўрада, як у выпадку з "Пісьмом…" "…ці магла пячатка таго "ронду" (Нацыянальнага ўраду. – Д.А.), або яго друкарні адціснуцца на "Мужыцкай праўдзе", шэсць нумароў якой пабачылі свет яшчэ ў 1862 г., а сёмы – некалькі пазней, з некаторай затрымкай, але да канчатковага пераўтварэння ЦК у паўнапраўны "ронд?" [6, с. 35].

Кола палемічных праблем ахоплівае таксама пытанне аб востраканфліктных адносінах паміж К. Каліноўскім і варшаўскім ЦНК. Наяўнасць канфліктаў пацвярджаюць сведчанні лідара беларускіх "белых" Я. Гейштара, сакратара польскага нацыянальнага ўрада Ю. Яноўскага, гісторыкаў В. Пшыбароўскага і генерала В. Ратча, якія выкарыстаў у якасці аргументацыі М. Біч. Гісторык адзначае, што К. Каліноўскі вёў актыўную барацьбу з польскімі дзеячамі па прынцыповых для беларуска-літоўскага боку пытаннях, сярод якіх права беларускага і літоўскага народаў на стварэнне самастойнай дзяржавы, раўнапраўнасць Літоўскага Камітэта ў падрыхтоўцы і ажыццяўленні паўстання. Аднак У. Казбярук ігнаруе факт прынцыповых канфліктаў паміж К. Каліноўскім і варшаўскім урадам, пераводзячы іх у іншую плоскасць: "Вельмі вострых канфліктаў хапала і ў самім варшаўскім кіраўніцтве, дзе неаднаразова адбываліся такія змены,

якія Ю. Пілсудскі называў “дзяржаўнымі пераваротамі”. Канфлікты тыя ніяк не былі абумоўлены адносінамі да нацыянальных праблем” [7, с. 4].

У вызначэнні ролі і месца К. Каліноўскага ў беларускім дэмакратычным руху У. Казбярук падводзіць чытача да наступнай высновы: “Радыкальная сацыяльная праграма К. Каліноўскага адвяла яму ў гісторыі грамадска-палітычнай думкі ганаровае месца. Больш радыкальнымі за яго – прытым толькі ў ХХ ст. – аказаліся бальшавікі, якія павялі працоўныя масы на штурм старога свету, абяцаючы мір народам, зямлю сялянам і фабрыкі рабочам. Але не будзем згадваць, што з гэтых абяцанняў атрымалася на самай справе пазней” [7, с. 4]. Кожны даследчык мае права на існаванне сваёй уласнай навуковай пазіцыі. Нягледзячы на высокі прафесійны ўзровень і глыбокае веданне матэрыялу ўдзельнікі працяглай дыскусіі не прыйшлі да адзінства і засталіся пры сваіх меркаваннях і перакананнях. На наш погляд, многія пытанні палемікі на сёняшні дзень застаюцца адкрытымі і маюць актуальнасць для далейшага даследавання.

**Літаратура**

1. Біч М. І думаў аб самастойнасці Літвы… // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 5. С. 37–41.

2. Біч М. Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863–64 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 3. С. 36–46.

3. Біч М. Пошук ісціны ці шальмаванне? // Голас Радзімы. 1997. 11, 18 снеж.

4. Біч. М. У крывым люстэрку: Кастусь Каліноўскі: праўда і вымыслы // Настаўніцкая газета. 1991. 17, 24, 27 ліп.

5. Біч М. Хай нарадзіцца ісціна… // ЛіМ. 1991. 22 лют.

6. Казбярук У. Загадка Каліноўскага // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 5. С. 32–36.

7. Казбярук У. Канстанцін Каліноўскі і яго нацыянальная ідэя // Голас Радзімы. 1997. 2, 9, 16, 23 кастр, 11, 18 снеж.

8. Казбярук У. Маякі і міражы: Ля вытокаў беларускага нацыянальнага адраджэння // ЛіМ. 1990. 7 снеж.

9. Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / Уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. Мінск, 1999.

10. Кісялёў Г. Каліноўскі і беларуская нацыянальная ідэя // Голас Радзімы. 1996. 11, 18, 25 студз.

11. Кісялёў Г. Здарэнне з Яськам-гаспадаром: [Аб гіст.-дакум. помніку “Пісьмо ад Яська-гаспадара з-пад Вільні да мужыкоў зямлі польскай”] // Полымя. 1994. № 6.

12. Кісялёў Г. К. Каліноўскі // Голас Радзімы. 1993. 3, 5, 18 сак, 1 крас.

13. Кісялёў Г. Каліноўскі знаёмы і незнаёмы // Полымя. 1993. № 6.